# КАВУНЫ ПА-БЕЛАРУСКУ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— Для захавання кавуноў у нашы дні актыўна выкарыстоўваюцца фунгіцыды, якія змагаюцца з гнілямі, — тлумачыць Мечыслаў Сцяпура. — Трапляючы на плод, малекула такога прэпарату на працягу пяці—дзесяці хвілін забівае ўвесь міцэлій. Апрацаваныя гэтым сродкам кавуны захоўваюцца па паўгода. Іх можна кідаць, трэсці, не вытрымліваць тэмпературу захоўвання — гніць яны не будуць. Бяда толькі ў тым, што такія хімічныя прэпараты небяспечныя для чалавека. Іх малекулы ўжыўляюцца ў скурку плода і не вымываюцца вадой. Былі выпадкі атручэння людзей такімі апрацаванымі кавунамі, набытымі на трасе і нават у гіпермаркетах.

***— Такім чынам, экалагічна чысты кавун можна вырасціць толькі самастойна?***

— На жаль, тыя, што вязуць здалёк, — адназначна апрацаваныя «хіміяй». Мне не раз задавалі пытанне, як захаваць кавуны без выкарыстання фунгіцыдаў. Але, на жаль, без «штукарства» кавун захоўваецца толькі месяц, максімум — паўтара. Як і дыня. Высокае ўтрыманне цукроў — добры фон для размнажэння гніласных бактэрый. Каб расцягнуць тэрмін захоўвання на два месяцы, можна захоўваць іх пры 0 градусаў, у моху, пяску, гліне. Але паўгода ў экалагічна чыстых умовах кавун у вас не праляжыць.

***— Ці ёсць сэнс, напрыклад, для дачнікаў, вырошчваць беларускія кавуны?***

— Безумоўна. Кавун у Беларусі вырасціць лягчэй, чым агурок. Вырошчваюць яго, дарэчы, таксама праз расаду. Проста беларусы не прывыклі да гэтай культуры, і людзі баяцца, што нічога не атрымаецца. Але клімат у тым жа Растове-на-Доне — рэзка кантынентальны: днём тэмпература падымаецца да 40 градусаў, а ўначы холадна. І расліна вытрымлівае такія перапады. У нас такіх ваганняў няма, клімат мяккі. А галоўнае — для гэтай культуры ў нас падыходзяць глебы. Кавуну патрэбныя паветрапранікальныя глебы. У Беларусі такіх глеб шмат — на 70 % гэта супесак, рыхлы супесак, лёгкі суглінак. Расце кавун ва ўсіх абласцях нашай краіны, у тым ліку на Віцебшчыне, толькі трэба выконваць тэхналогію.

## Галандскія кавуны для беларускіх дачнікаў

Для нашай кліматычнай зоны асабліва значэнне мае колькасць дзён ад завязвання да поўнага паспявання пладоў — і дзён гэтых павінна быць як мага менш, бо цёплы сезон у параўнанні з паўднёвымі краінамі ў нас кароткі. Усё ж бахчавыя культуры для нас нязвыклыя, і айчынныя селекцыянеры вывядзеннем іх новых сартоў асабліва не займаюцца. У беларускіх умовах раяніраваны (ўсебакова выпрабаваны і рэкамендаваны для вырошчвання) расійскі сорт «Огонек». Сярод апошніх распрацовак — уласна беларускі сорт кавуна «Сцяпурскі»: ён названы ў гонар свайго стваральніка і пакуль не прадстаўлены ў дзяржаўную камісію па сортавыпрабаванні.

— Па сутнасці, гэта палепшаны варыянт «Огонька», — тлумачыць суразмоўца. — Ён таксама мае цёмна-зялёную афарбоўку, але калі «Огонек» дае плод па паўтара-два кілаграмы, наш новы сорт — гэта кавуны вагой па шэсць кілаграмаў.

На эксперыментальных участках навукоўцы займаюцца таксама вырошчваннем галандскіх гібрыдных сартоў кавуноў — «Раманза», «Топган», «Бедуін».

— Расійскімі сартамі мы не займаемся, — расказвае Мечыслаў Францавіч. — Як адзначае акадэмік Півавараў, расійскія сарты і гібрыды могуць рэалізаваць свой патэнцыял да 44-й шыраты. Беларусь размешчана на 52-й шыраце, Галандыя — на 50-51-й. Там кліматычныя ўмовы бліжэй да нашых. Мы спрабавалі расійскія сарты — яны нядрэнна растуць у Беларусі, але не паспяваюць выспець.

***— А як вырошчваць кавуны ў Беларусі? У цяпліцах?***

— Можна ў цяпліцах, а прасцей — у адкрытым грунце. Галоўнае — праз расаду. У Расіі кавуны вырошчваюць з насення — сеюць проста ў грунт. Але там не шкадуюць пасяўны матэрыял, бо ён танны. А галандскае насенне — 1000 семечак — каштуе 40 еўра. Таму падыходзіць да пытання трэба далікатна.



**Фермеры расказваюць: пакуль не прададуць беларускія кавуны, прывазныя людзі не купляюць. У кавунах, якія прывозяць здалёк, толькі 6 % цукру, бо іх ірвуць недаспелымі. А ў нашых — мінімум 8 %.**

## «Меншыя браты»

Галоўная праблема, з якой сутыкаюцца агароднікі пры вырошчванні бахчавых культур у нашых шыротах, — не капрызы надвор'я і не позні замаразкі. Галоўны вораг ураджаю кавуноў — гэта насякомыя. Каранёвая сістэма кавуноў салодкая. Калі вы пасееце насенне, то «меншыя браты» — мядзведкі, драцянікі, лічынкі хрушчоў — не дадуць «нованароджаным» карэньчыкам шанцу адужаць. Таму кавуны ў нас трэба вырошчваць толькі праз расаду, каб пасадзіць расліны ў грунт ужо з добра развітой каранёвай сістэмай. Хоць і яе таксама паспяхова аб'ядаюць.

— Часам мне тэлефануюць агароднікі-аматары: «Што вы нас падманваеце? Не растуць кавуны ў Беларусі! Я ўсё зрабіў правільна, а яны не растуць», — расказвае Мечыслаў Сцяпура. — Тады я раю вырваць з зямлі адну расліну. І аказваецца, што яна лёгка дастаецца, таму што каранёў, па сутнасці, ужо няма — іх з'елі.

***— Гэтая праблема — менавіта беларуская?***

— Гэтая праблема цяпер паўсюль. Раней у зямлю актыўна ўносілі арганіку. У маёй маладосці ў Беларусі на гектар у сярэднім прыходзілася 33 тоны арганікі (і торф, і гной), а цяпер — каля шасці тон. Нямала гаспадарак, якія цалкам перайшлі на мінеральныя ўгнаенні. Як вынік, раней мікраарганізмы і насякомыя пераtраўлялі салому, што змяшчаецца ў арганіцы, і такім чынам стваралі спрыяльнае асяроддзе для каранёў раслін, а цяпер — адразу накідваюцца непасрэдна на карані. Арганікі цяпер проста няма, нават у вёсках. Раней у кожнай вёсцы была стайня на 20—30 коней, кароўнік, хлеў для цялят. Кожны гаспадар на ўласным падворку трымаў карову, свіней, курэй, гусей, авечак. Цяпер людзям прасцей купіць мяса і малако ў гіпермаркеце.

***— Што ж рабіць са шкоднікамі?***

— Абараняць расліны. З дапамогай той жа хіміі — куды ж без яе?.. Але каб мінімізаваць яе ўплыў, лепш рабіць «калатушу» з гліны і гною, дадаваць туды ахоўныя прэпараты і ў гэтую сумесь абмакваць карані саджанцаў перад высадкай у грунт. Калі гліна падсохне, атрымаецца «глазур».

***— А калі выкарыстоўваць народныя сродкі?***

— Можна паспрабаваць попел — у 1960-я, калі я быў падлеткам, з яго дапамогай паўсюдна змагаліся з насякомымі-шкоднікамі. Але ў кожную пасадачную ямку трэба высыпаць дзве-тры шклянкі попелу. Попел — пастка для шкоднікаў, яны ў ёй задыхаюцца, але для гэтага пласт попелу павінен быць досыць тоўсты. І попел варта выкарыстоўваць прасеяны праз сіта. Але лепш усё ж прымяніць інсектыцыд.

***— Але ж мы хацелі атрымаць экалагічна чысты прадукт...***

— Ён і будзе экалагічна чысты — з папраўкай на сучасныя рэаліі. У Беларусі «хіміяй» палі апрацоўваюцца два-тры разы на сезон, у краінах Еўропы — у сярэднім 24 разы за такі ж перыяд. Так што еўрапейцы, прыязджаючы да нас, адзначаюць, што нашы агародніна і садавіна маюць непаўторны натуральны смак.

## Стратэгія поспеху

Калі вы вырашылі вырасціць каля дома кавун — вось вам простая інструкцыя ад найлепшага ў краіне спецыяліста па бахчавых культурах.

• **Купляем насенне.** Цяпер — найлепшы час для гэтага. Сарты — галандскія гібрыды (бяспройгрышны варыянт, усходжасць — 98 %) або правераны «Огонек».

— Толькі не купляйце насенне кавуна на базары: можаце нарвацца на сорт з вялікім перыядам вегетацыі. Для Беларусі патрэбны тэрмін ад пасадкі на расаду да выспявання плода не больш за 75 дзён (а лепш — 72 дні). Але з Расіі да нас прывозяць насенне кавуна з тэрмінам выспявання 80-90 сутак. Атрымаць ураджай такіх сартоў у нас немагчыма.

• **На расаду насенне саджаем 15 красавіка.** На Віцебшчыне — зрушваем тэрміны дзён на пяць. У збанкі набіваем намочаны вадой торф з разліку 0,5 л торфу на адно семечка. Насенне папярэдне замочваюць у марлі на 6-8 гадзін. Прарошчваць расаду варта на паўднёвым акне пры тэмпературы 24—28 градусаў.

— Ні ў якім разе не бярыце торф чорнага колеру. У яго вялікая шчыльнасць, і ў ім гіне практычна любое насенне, асабліва — гарбузовых культур.

• **Высаджваем расаду ў адкрыты грунт пасля 20 мая.** У кожную лунку дадаём попел, а карані акунаем у гліняную «калатушу» з інсектыцыдам. Трымаем пасадкі пад плёнкай да 15 чэрвеня.

• **Плёнку прыбіраем,** расткі раскладваем па зямлі і прымацоўваем — каб іх не скруціў вецер і каб яны таксама далі карэньчыкі: расліна атрымае дадатковае харчаванне.

• **Астатняе проста:** паліў, праполка. Ураджай збіраем з 5 да 15 жніўня!

— Дарэчы, можна вырошчваць у нас і дыні (таксама галандскай селекцыі) — гэтую культуру лепш высаджваць у цяпліцу. Тут ёсць адна хітрасць, якая гарантуе ўраджай. У маладой расліны падвязваюць цэнтральнае сцябло. Калі на ім з'явіцца пяты ліст, абразаем верхавіну. З пазух лісця з'явяцца парасткі. Пакідаем два з пяці, і таксама абразаем верхавіну кожнага парастка пасля таго, як на іх вырасце па шэсць лісцікаў. Тады з гэтых парасткаў з'явяцца наступныя, на якіх і будзе цвіценне па жаночым тыпе і пладанашэнне. Калі вы гэта не зробіце, пладоў можна не дачакацца — атрымаеце толькі зялёную масу.

## Кавуны замест агуркоў?

Як расказаў навуковец, бахчавыя культуры паступова заваёўваюць нашы палі і прысядзібныя соткі.

— Кавунамі ўжо займаюцца многія. Узяць хоць бы Маларыцкі раён — там цэлыя вёскі вырошчваюць кавуны. Па Мінскай вобласці — у Смалявічах ёсць даволі вядомы ў краіне фермер, Уладзімір Аляксандравіч Крапіўка, ён таксама вырошчвае кавуны. Ёсць фермеры і проста аматары, якія займаюцца кавунамі ў Століне, Слуцку, Рэчыцы, нават на Віцебшчыне. Яны расказваюць: пакуль беларускія кавуны не прададуць, прывазныя людзі не купляюць. Таму што нашы, «толькі з градкі» — маюць зусім іншы смак. Астрахань ад Беларусі — за тысячы кіламетраў. Каб прывезці адтуль кавун, яго рвуць недаспелым. І таму ў кавунах, якія сюды прывозяць здалёк, толькі 6 % цукру. А ў нашых, беларускіх — мінімум 8 %.

Нават на Піншчыне, у самым агурочным рэгіёне краіны, некаторыя гаспадаркі пераходзяць з агуркоў на кавуны, гаворыць Мечыслаў Францавіч.

— З аднаго боку, агуркі пачалі хварэць нематодай — занадта доўга іх саджалі на адным і тым жа месцы, — тлумачыць суразмоўнік. — З другога — на мяжы з Беларуссю, на Смаленшчыне, расіяне пабудавалі 400 га цяпліц, і з-за аб'ёмаў сабекошт агародніны там ніжэйшы, чым у нас. Так што многія гаспадаркі пераходзяць з традыцыйных агуркоў-памідораў на іншыя культуры — ягады (у першую чаргу суніцы, тыя ж кавуны), кветкі.

А вось нязвыклыя для беларускага агародніка віды агародніны: селекцыянеры вырасцілі для нашых умоў і айчынныя сарты цыбулі-парэю, і брокалі, і кальрабі, і савойскай капусты — але пакуль не сустрэлі разумення ні ў дачнікаў, ні ў фермераў. Затое палюбіўся народу сорт салодкага перцу «Парнас», які пераўзыходзіць па ўраджайнасці нават галандскія сарты.

— Нашаму «Парнасу» ўжо каля пяці гадоў. Цяпер яго вырошчваюць фермеры, дачнікі, вяскоўцы. Ён заласціста-жоўты, таўшчыня сценкі — 7-8 мм, у ім шмат цукроў і больш за 150 мг вітаміну С. Маса аднаго плода даходзіць да 400 г: у сярэднім на кілаграм — тры перцы. «Парнас» падыходзіць і для свежых салатаў, і для кансервавання. Многія дзякуюць мне за гэты сорт, — усміхаецца суразмоўнік. — Неяк патэлефанавала пажылая дама і кажа: «Дзякуй, што навучылі мяне перац есці». Аказалася, да таго, як пасадзіць наш сорт, яна цярпець не магла гэтую агародніну. Пасадзіла не для сябе — для сваіх дамашніх. Але пакаштавала наш «Парнас» — і палюбіла гэты смак.



**Можна вырошчваць на прысядзібным участку і дыні, сцвярджаюць навукоўцы. Галоўнае — вытрымліваць тэхналогію.**

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**